МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў XXI СТАГОДДЗІ

Актуальныя аспекты даследавання

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Філалагічны факультэт
Савет маладых вучоных

МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў XXI СТАГОДДЗІ

Актуальныя аспекты даследавання

Матэрыялы III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі маладых навукоўцаў

Мінск, 27 сакавіка 2015 г.

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2015

УДК 80(06)
ББК 80я431
М74

Рэдкалегія:
П. І. Навойчык (адказны рэдактар), *А. А. Акушэвіч, А. А. Албут, А. А. Занкавец, В. У. Зуева, В. А. Лойка, А. У. Лянкевіч, Ю. В. Малаткова, І. С. Самахвал, М. У. Саўко, І. Ч. Часнок*

М74 **Мова** і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання : матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф. маладых навукоўцаў, Мінск, 27 сак. 2015 г. / рэдкал. : П. І. Навойчык (адк. рэд.) [і інш.] ; Бел. дзярж. ун-т. — Мінск : БДУ, 2015. — 318 с.
ISBN 978-985-553-295-9.

Больш за 70 дакладаў прысвечаны актуальным пытанням мовазнаўства, літаратуразнаўства, фалькларыстыкі і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін. Пададзены вынікі этнакультурных, супастаўляльных і кагнітыўных даследаванняў.

Зборнік прызначаны для аспірантаў, выкладчыкаў, студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў філалагічнага профілю, а таксама для ўсіх, каго цікавяць праблемы і перспектывы сучаснага мовазнаўства і літаратуразнаўства.

УДК 80(06)
ББК 80я431

ISBN 978-985-553-295-9

© Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2015
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2015

ПЛЕНАРНЫЯ ДАКЛАДЫ

Акушэвіч А. А. (Мінск)

Элементы «свяшчэнных» моў у творчай спадчыне Францыска Скарыны

Свяшчэннае трохмоўе (trilingua sacra) зрабілася ў эпоху Рэнесансу асновай гуманітарна-асветніцкай парадыгмы. Ж. Некрашэвіч-Кароткая, характарызуючы спецыфіку слоўнай культуры эпохі Рэнесансу, адзначае, што дзякуючы Ё. Ройхліну, аўтару трактатаў "De verbo mirifico" ("Пра чарадзейнае слова", 1514), "De arte cabbalistica" ("Пра кабалістычнае мастацтва", 1517) і іншых, "*сфарміравалася цікавасць да ўсіх трох "свяшчэнных" моў — старажытнаяўрэйскай, старажытнагрэчаскай і лацінскай*" [6, с. 46]. Зразумела, што ўеўрапейскім культурным арэале ў XVI ст. вядучую ролю адыгрывала лацінская мова. На гэтай мове пісалі свае творы Ян Вісліцкі, Мікалай Гусоўскі і іншыя аўтары ВКЛ, да таго ж, Lingua Latina была мовай навукі і культуры ў тагачаснай Еўропе. Аднак нават у творчасці лацінамоўных паэтаў можна заўважыць цікавасць да ўсіх "свяшчэнных" моў. Так, на апошняй старонцы кнігі Мікалая Гусоўскага "Песня пра зубра" (Кракаў, 1523) змешчана гравюрная выява ў атачэнні выслоўяў на старажытнаяўрэйскай, старажытнагрэчаскай і лацінскай мовах, якія адлюстроўваюць асноўныя палажэнні эстэтычнай праграмы паэта [гл.: 5, с. 126–129].

Цікавасць да "свяшчэнных" моў можна заўважыць і ў творчай спадчыне Францыска Скарыны. Беларускі першадрукар выкарыстоўвае ў сваіх выданнях іншамоўныя элементы, крыніцай якіх з'яўляюцца біблейскія тэксты. Дадзеныя элементы выконваюць, найперш, функцыю экзегезы. Разам з тым, ужыванне замежных слоў дазваляе паказаць абазнанасць перакладчыка ў сваёй справе, увесці новы пераклад у шэраг іншых перакладаў. У сувязі з гэтым, варта заўважыць, што Францыск Скарына падае ў сваіх прадмовах і звесткі пра гісторыю стварэння і перакладаў кніг Бібліі (гл., напр., "Предословие доктора Франъциска Скорины в книгу Премудрости Божией" [7, с. 29] і "Починается другая предъмолъва доктора Франъциска Скорины в книгу Исуса Сирахова" [7, с. 23–24]). С. Шупа звяртаўся да аналізу іншамоўных элементаў у выданнях першадрукара пры высвятленні пытання наконт яго моўнай кампетэнцыі [9], асобны артыкул прысвечаны элементам старажытнаяўрэйскай мовы ў пражскіх кнігах Бібліі Францыска Скарыны [8].

У сваіх выданнях беларускі асветнік выкарыстоўвае наступныя іншамоўныя біблейскія цытаты. У прадмове да ўсёй Бібліі: "*тако убо*

с них; 14 — нун —вечность; 15 — самех — помощ; 16 — аин — кладезь; 17 — фе — уста; 18 — цади — правда; 19 — коф — возвание; 20 — реш — глава; 21 — шин — зубы; 22 — таф — знамена" [7, с. 73]. Гэты алфавіт першадрукар размяшчае і непасрэдна ў тэксце кнігі "Плач Ераміі" [3, с. 677–693], спрабуючы такім чынам перадаць яе асаблівасці пры перакладзе, пра што і гаворыць у працытаваным вышэй урыўку.

У канцы агульнага пасляслоўя да ўсіх чатырох кніг "Царстваў" і пасляслоўя да кнігі "Ісус Навін" змешчана малітва на старажытнагрэчаскай мове: "*То Фео харитас*" [7, с. 39]; "*То Фео Харитас"* [7, с. 43]. Беларускі вучоны А. Коршунаў адносна яе робіць наступную заўвагу: "*У перакладзе гэты выраз азначае: дзякуй Богу*" [7, с. 39]. Тэкст кнігі "Ісус Навін" першадрукар заканчвае лацінскімі словамі: "Сит Део лавс. Аминь "(у перакладзе: "Няхай будзе Богу хвала. Амінь") [2, с. 826]. Пасляслоўе да названай кнігі пачынаецца на наступнай старонцы.

Францыск Скарына выкарыстоўвае словы "Аллилуйа" і "Аминь" без перакладу. Першае — у гімнаграфічных творах: "*поем тому вси: Аллилуйа!*" [7, с. 80]; "*Тому и мы вси, вернии, поем: Аллилуйа!*" [7, с. 87]. Другое слова ўжываецца пры малітвах, "свабодна выкладзеных малітвах" [4, с. 11] і ў цытатах: "*Богу во Троици единому и Пречистой Матери Его Марии ко славе со всеми светыми вовеки веком. Аминь*" [7, с. 113]; "*Буди Богу хвала вовѣки веком. Аминь*" [7, с. 76]; "*Аминь, глаголю тобѣ днесь, со мною будеши в раи*" [7, с. 41] (Лк. 23:43). Параўнайце: "*І сказаў яму: "Сапраўды кажу табе: сёння будзеш са Мною ў раі*" [1, с. 938].

У "Акафісце імю Ісуса Хрыста" змешчаны наступны фрагмент з іншамоўным словам і яго перакладам: "*Дай нам, Ісусе, Сыне Божий, разум, и отверзи уста наша, да возможем возвестити хвалу имени твоего, яко же дал еси слух и молву глухому и гугнивому, глаголя: "Еффета", еже ест — разверзися*" [7, с. 88]. Слова *"Еффета"* і яго пераклад уваходзяць у біблейскую цытату: "*І, глянуўшы ў неба, уздыхнуў і гаворыць: "Эфэта", што значыць: "Адкрыйся*" [1, с. 896] (Мк. 7:34).

Прадмову да "Першага паслання апостала Паўла да Цімафея" Францыск Скарына завяршае словам: "*Телос*". А. Коршунаў дае да яго наступны каментарый: "*У перакладзе з грэчаскай мовы: Канец*" [7, с. 120]. Дадзенае слова паказвае, што прадмова скончылася. Пасля адпаведнага паслання няма пасляслоўя.

Заўважым таксама, што фармальна імёны біблейскіх персанажаў і геаграфічныя назвы мясцін са Свяшчэннага Пісання з'яўляюцца іншамоўнымі словамі, якія былі засвоены ў мове выданняў Францыска

Скарыны. Назвы месяцаў, якія часам выкарыстоўвае першадрукар, таксама маюць іншамоўнае паходжанне: "*Выдана и выложена повѣлением и працею ученаго мужа Франциска Скорины из славнаго града Полоцка, в науках и в лекарстве учителя, у великом месте Празском по летех нарожения нашего спасителя тысеща пятистех и деветинадесяти, месеца книжънаго декаврия, дня пятогонадесеть*" [7, с. 76] ("*Декаврий*" — ад лац. December; "*октяврий*" [7, с. 23] — ад лац. October).

Такім чынам, беларускі першадрукар выкарыстоўвае ў сваіх выданнях словы і выразы на старажытнаяўрэйскай, старажытнагрэчаскай і лацінскай мовах. Іх ужыванне падпарадкавана мэтам экзегезы. Адначасова прыклады з Бібліі на "свяшчэнных" мовах падмацоўваюць пераклад першадрукара, дапамагаюць паставіць яго працу ў адзін шэраг з папярэднімі аўтарытэтнымі ўзорамі, сведчаць пра зварот асветніка да першакрыніц і пацвярджаюць узровень яго перакладчыцкага майстэрства. Францыск Скарына звычайна прыводзіць пераклад іншамоўных слоў і выразаў, што важна для неабазнанага чытача. Разам з тым, цікавасць да "свяшчэнных" моў адпавядае асаблівасцям еўрапейскага літаратурнага працэсу XVI стагоддзя.

1. Біблія : Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запаветаў / МХРБ "Біблейскае таварыства ў Рэспубліцы Беларусь". – Мінск : МХРБ "Біблейскае таварыства ў Рэспубліцы Беларусь", 2012. – 1120 с.
2. Біблія : факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Ф. Скарынаю ў 1517–1519 гадах : у 3 т. – Мінск : БелСЭ, 1990–1991. – Т. 1. – 830 с.
3. Біблія : факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Ф. Скарынаю ў 1517–1519 гадах : у 3 т. – Мінск : БелСЭ, 1990–1991. – Т. 3. – 782 с.
4. Кароткі, У. Г. Беларускія прадмовы і пасляслоўі другой палавіны XVI – першай палавіны XVII ст. / У. Г. Кароткі // Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Скарыны / уклад., уступ. арт. і камент. У. Г. Кароткага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 6–22.
5. Некрашэвіч-Кароткая, Ж. В. Беларуская лацінамоўная паэзія : ранні Рэнесанс / Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая. – Мінск : БДУ, 2009. – 271 с. : іл.

Барадзіна Ю. С. (Мінск), Гецэвіч Ю. С. (Мінск)

Апрацоўка колькасных выразаў з адзінкамі вымярэння: ад навукова-тэхнічнага тэксту да тэлеметрыі

Па-за межамі фундаментальнай навукі тэкст прадстаўляе інтарэс для спецыялістаў шырокага кола як носьбіт пэўнай інфармацыі.

Тэлеметрыя — гэта тэхніка вымярэнняў на адлегласці [5], а таксама непасрэдныя вынікі гэтых вымярэнняў. Даныя тэлеметрыі

звычайна перадаюцца з дапамогай радыёсігнала ці іншых сродкаў бесправадной сувязі. У дачыненні да нана- і пікаспадарожнікаў інфармацыя перадаецца з дапамогай тэлетайпа і апісвае параметры тэмпературы, ціску, напружання, тока і г. д.

Нана- і пікаспадарожнікі ўяўляюць сабой вельмі малыя касмічныя лятальныя апараты, якія па памеры часта дасягаюць усяго 10×10×10 сантыметраў, з'яўляюцца адносна таннымі ў параўнанні з больш вялікімі спадарожнікамі і з гэтай прычыны належаць пераважна ўніверсітэтам ці студэнцкім групам. Колькасць такіх спадарожнікаў у космасе зараз перавышае 200, і кожны з іх, акрамя традыцыйных і аднолькавых для ўсіх паказчыкаў тэмпературы, ціску, напружання і току, мае свае дадатковыя параметры вымярэння, абумоўленыя рознымі місіямі спадарожнікаў.

У межах праекта Беларусі і Расіі па развіцці касмічнай праграмы перад намі была пастаўлена задача распрацаваць алгарытмы класіфікацыі, аналізу і апрацоўкі колькасных выразаў з адзінкамі вымярэння (далей КВАВ) у тэкстах тэлеметрыі для разгортвання лічбавых даных у поўную арфаграфічную форму з улікам усіх граматычных асаблівасцей дапасавання ў родзе, ліку і склоне, якім у беларускай і рускай мовах падпарадкоўваюцца лічэбнікі ў спалучэнні з пэўнымі назоўнікамі. Гэта, у сваю чаргу, неабходна для правільнага сінтэзавання маўлення па тэксце.

Задача першапачаткова вырашалася для навукова-тэхнічных тэкстаў з высокай шчыльнасцю КВАВ у іх. Так, успрымаючы і паняцце навукова-тэхнічнага тэксту, і паняцце адзінкі вымярэння максімальна шырока, мы натрэніравалі дапаможную праграму NooJ [4] на апрацоўку больш чым 120 вытворных і невытворных адзінак вымярэння на беларускай і рускай мовах.

Створаны алгарытм апрацоўвае спалучэнні накшталт *1 Гц, 50 В, 44 мА, -95 °С* і пераўтварае іх у поўны арфаграфічны запіс: *адзін герц, пяцьдзесят вольт, сорак чатыры міліамперы, мінус дзевяноста пяць градусаў Цэльсія.* На малюнку 1 прыводзіцца выгляд некаторых частак алгарытму апрацоўкі КВАВ, зробленага ў праграме NooJ. Графы чытаюцца справа налева, пры гэтым вузлы ўтрымліваюць лічбы, паслядоўнасць літар ці слова, якое праграма павінна шукаць, а дугі адлюстроўваюць сувязі. Шэрыя вузлы — гэта падграфы, у кожным з якіх знаходзіцца дадатковы граф.

Акрамя прыведзеных вышэй прыкладаў, алгарытм здольны апрацоўваць і такія больш складаныя з пункту погляду дапасавання канструкцыі, як спалучэнне некалькіх адзінак вымярэння ў адной

(*38 м/с — трыццаць восем метраў у секунду*), дапасаванне назоўніка да дробнага лічэбніка (*8,157 га — восем цэлых сто пяцьдзесят сем тысячных гектара*), асобныя выпадкі разгортвання лічэбніка (*2 сут — двое сутак*) і інш.

Гэтыя алгарытмы былі рэалізаваныя для трох склонаў: назоўнага, роднага і вінавальнага. КВАВ у гэтых трох склонах сустракаюцца найбольш часта ў тэкстах; так, нават з трыма склонамі з шасці алгарытм быў здольны знайсці ў корпусе больш за 80 % усіх адзінак.



Мал. 1 Фрагменты алгарытмаў апрацоўкі КВАВ: злева зверху частка для апрацоўкі лічэбнікаў, справа апрацоўка адзінак вымярэння і злева знізу агульны выгляд

На малюнку 2 прыведзены прыклад працы алгарытма: у верхняй частцы знойдзеныя, але не апрацаваныя прыклады КВАВ, у ніжняй яны ж, але ўжо апрацаваныя і разгорнутыя ў поўную арфаграфічную форму.

Больш падрабязна праца алгарытмаў апрацоўкі КВАВ разгледжана ў [1, с. 634] і ў [2, с. 282].

Апісаны ніжэй на малюнку 2 алгарытм быў зроблены пад гіпатэтычны тэкст спадарожнікавай тэлеметрыі. Пасля візіту на радыёстанцыю БДУ па прыёме сігналаў са спадарожнікаў мы атрымалі рэальныя прыклады тэлеметрыі, якія ў сырым выглядзе значна адрозніваюцца ад папярэдняй гіпотэзы; напрыклад, фрагмент тэлеметрыі:

- ☐ 2015-01-01T01:29:37.060Z JA6PL (130.718611E; 33.862056N) frame: 88 88 60 AA AE 8A 60 88 A0 60 AA AE 8E E1 03 F0 80 48 20 64 64 89 B5 21 02 03 1F 02 23 06 00 88 21 4F D8 42 5D 64 50 10 16 00 0E A4 10 09 00 0E 20 01 F3 F7 E3 1D DF F1 E5

Before	Seq.	After
з 6 КА ~	не меней за 100 Мбіт у суткі	. Аб'ём
шчыльнасць осмію -	22 500 кг/м^3	, шчыльнасць атамных
дыяметр складае	каля 70 тыс. парсек	, адлегласць ад
яно роўнае	~9,8 м/с^2	. Другая касмічная
перамяшаным слоі	складае 35 і 8 ат. %	адпаведна і
/кг альбо	30-300 кБк/м2	, сярэдняя вылічаная
бакоў зазор	не меней 5 мм	для пашырэння
чыстага грунту	1,57*10^6 м	. У цяперашні
арбіт спадарожнікаў	117,6 тыс. км	і 74 тыс
да габарытаў	15×60×60 см	і пераносіцца
часткі памяшканняў	100 мр/г	: харчовай тары
вельмі вялікі {	32' x 32'	}, у гэту
Before	**Seq.**	**After**
з 6 КА ~	не меней за сто мегабіт у суткі	. Аб'ём
шчыльнасць осмію -	дваццаць дзве тысячы пяцьсот кілаграмаў на метр у трэцяй ступені	, шчыльнасць атамных
дыяметр складае	каля сямідзесяці тысяч парсек	, адлегласць ад
яно роўнае	каля дзевяці цэлых васьмі дзясятых метра ў секунду ў другой ступені	. Другая касмічная
перамяшаным слоі	складае трыццаць пяць і восем атамных працэнтаў	адпаведна і
/кг альбо	трыццаць дэфіс трыста кілабекерэляў на метр у другой ступені	, сярэдняя вылічаная
бакоў зазор	не меней пяці міліметраў	для пашырэння
чыстага грунту	адна цэлая пяцьдзесят сем сотых на дзесяць у шостай ступені метраў	. У цяперашні
арбіт спадарожнікаў	сто семнаццаць цэлых тэсць дзясятых тысячы кіламетраў	і 74 тыс
да габарытаў	пятнаццаць на шэсцьдзесят на шэсцьдзесят сантыметраў	і пераносіцца
часткі памяшканняў	сто мілірэнтген у гадзіну	: харчовай тары
вельмі вялікі {	трыццаць два дзюймы на трыццаць два дзюймы	}, у гэту

Мал. 2 Вынік апрацоўкі КВАВ у праграме NooJ

У прыведзеным фрагменце тэлеметрыі ўсе лічбы, якія ідуць пасля "frame:" — гэта шаснаццаткавы код, які павінен быць дадаткова дэкадзіраваны (крок 1). Ніжэй прыводзіцца прыклад даступнага нам дэкадзіраванага радка тэлеметрыі ўжо іншага спадарожніка:

- 2013-12-29
  17:19z $$50SAT,128,,1946,,,-15,3,,21,-16,78,,82,1210,3521,*75

Як можна бачыць, пасля дэкадзіроўкі тэкст набывае больш просты выгляд, але ўсё роўна з'яўляецца накіраваным хутчэй на машыннае ўспрыманне. Далей, для апрацоўкі тэлеметрыі кожнага са спадарожнікаў радыёаматарамі былі зробленыя дапаможныя камп'ютарныя праграмы, якія з радка лічбаў, раздзеленых коскамі, вымаюць пэўныя паказчыкі і прадстаўляюць іх у зразумелай форме з пазнакамі параметра, значэння і адзінак вымярэння (крок 2). Прыклад працы адной з такіх праграм можна бачыць на малюнку 3 [3].



Мал. 3 Выгляд праграмы-апрацоўшчыка тэлеметрыі спадарожніка $$50SAT

Тэлеметрыя ў вокнах праграмы разам з подпісамі дае ўжо больш зразумелую інфармацыю. Так, мы можам сказаць, што спадарожнік перадаў, што напружанне батарэі спадарожніка складае 3521 мілівольт.

Гэта запісана ў апошнім слупку насупраць меткі Battery Voltage. Патэнцыяльна распрацаваны раней алгарытм будзе здольны вылучыць атрыманыя з праграмы паказчыкі з адзінкамі вымярэння: -15 C, 3 mA, 21 mA, 82 mV — і разгарнуць іх у арфаграфічную форму: мінус пятнаццаць градусаў Цэльсія, тры міліамперы, дваццаць адзін міліампер, восемдзесят два мілівольты. Гэта і павінна складаць наш наступны крок — крок 3. Аднак заўважым, што адзінкі вымярэння, як і іншы тэкст у праграме, падаюцца на англійскай мове. Такім чынам, каб алгарытм, створаны для беларускай і рускай моў, прачытаў гэтыя спалучэнні, у яго трэба дадаць прамежкавы крок (крок 4) па перакладзе адзінак вымярэння.

Таксама там ёсць іншыя даныя, але без перакладу ці каментарыяў спецыяліста яны наўрад ці будуць несці нейкую карысную інфармацыю. Таму наступным крокам (крок 5) павінен быць пераклад і інтэрпрэтацыя метак у праграме.

Такім чынам, з улікам новага матэрыялу даследавання, роля непасрэдна лінгвістычнай апрацоўкі тэксту зніжаецца: цяпер алгарытмы разгортвання адзінак у скарочаным выглядзе ў поўны арфаграфічны запіс займаюць толькі адзін з прамежкавых крокаў (крок 3 ці 4). Астатнія жа крокі апрацоўкі павінны выконвацца з дапамогай спецыялістаў вузкага профілю, прынамсі, тэлеметрыстаў. З іншага боку, характар даных дазваляе крыху спрасціць існуючы алгарытм, напрыклад, за кошт склонаў ці колькасці адзінак вымярэння, паколькі ў праграме для тэлеметрыі яны сустракаюцца ў строга абмежаваным кантэксце, але дадатковыя задачы (пераклад і інтэрпрэтацыя абрэвіятур) таксама вымагаюць новых модуляў у алгарытме.

Улічваючы асаблівасці рэальных прыкладаў тэлеметрыі спадарожнікаў, задача аналізу і апрацоўкі даных тэлеметрыі зараз сутыкаецца з наступнымі цяжкасцямі:

1. Цяжкасць ва ўспрыманні тэксту (адсутнасць інфарматыўнасці) — першасныя даныя прадстаўлены ў выглядзе шаснаццаткавага кода;
2. Неабходнасць перавода тэксту ў "чалавекаўспрымальную" форму;
3. Неабходнасць дадатковай інтэрпрэтацыі даных спецыялістамі;
4. Адсутнасць еднасці ў фармаце тэлеметрыі з розных спадарожнікаў;
5. Патрэба ў аўтаматычным перакладзе колькасных выразаў з адзінкамі вымярэння з англійскай мовы на мэтавыя мовы.

Падсумоўваючы, можна зрабіць высновы, што з улікам рэальных, а не гіпатэтычных даных тэлеметрыі ўся задача апрацоўкі КВАВ тэлеметрыі і пераўтварэння іх у арфаграфічную форму вымагае не толькі

вырашэння новых дадатковых падзадач, але і супрацоўніцтва з профільнымі спецыялістамі.

1. Skopinava, A. M. Processing of quantitative expressions with units of measurement in scientific texts as applied to belarusian and russian text-to-speech synthesis / Yu. S. Hetsevich, A. M. Skopinava, B. M. Lobanov // Компьютерная лингвистика и интеллектуальные технологии : По материалам Международной конференции «Диалог» (Бекасово, 29 мая – 2 июня 2013 г.). Вып. 12 (19) : В 2 т. Т. 1 : Основная программа конференции. – М. : Изд-во РГГУ, 2013. – С. 634–651.

2. Гецэвіч, Ю. С. Мадэляванне і распрацоўка сістэм пошуку колькасных выразаў з адзінкамі вымярэння ў электронных тэкстах на беларускай і рускай мовах / Ю. С. Гецэвіч, А. М. Скопінава, А. Ф. Есіс // Развитие информатизации и государственной системы научно-технической информации (РИНТИ-2013) : доклады XII Международной конференции (Минск, 20 ноября 2013 г.). – Минск : ОИПИ НАН Беларуси, 2013. – С. 282–287.

3. Дэкодэр тэлеметрыі спадарожніка $50SAT – Eagle2 [Электронны рэсурс]. – 2013. – Рэжым доступу : http://www.50dollarsat.info/. – Дата доступу : 25.02.2015.

4. Лінгвістычны працэсар NooJ [Электронны рэсурс]. – 2002. – Рэжым доступу : http://www.nooj4nlp.net/pages/nooj.html. – Дата доступу : 01.07.2012.

5. Энциклопедия Кольера [Электронны рэсурс]. – 2013. – Рэжым доступу : http://dic. academic. ru/dic. nsf/enc_colier/5408. – Дата доступу : 25.02.2015.

Занковец А. А. (Минск)

Белорусское городское просторечие: основные направления исследования

Городское просторечие является отражением живых процессов в языке. Принято считать, что оно основывается на сочетании местных вариантов языка и разговорной речи, поэтому в каждом относительно крупном регионе обладает своеобразными отличительными чертами.

Уникальность белорусского городского просторечия определяется тем, что оно основано на двух языках — русском и белорусском, — а также на местных говорах. И это обеспечивает обширное поле для исследования — от наиболее очевидных фонетического и лексического уровней до анализа грамматических изменений в системе языка.

В настоящий момент существуют разнообразные и многочисленные возможности для изучения этих явлений. В качестве материала исследования можно привлекать не только аудиозаписи спонтанной монологической и диалогической речи, но и — благодаря социальным сетям и блогам — письменные тексты разной степени

подготовленности. Формат записей в социальных сетях различается, и это даёт возможность анализировать тексты разного объёма и разной степени подготовленности. Например, Twitter предусматривает создание очень коротких (140 знаков, считая пробелы) спонтанных текстов, поэтому данные сообщения в наибольшей степени отражают особенности городского просторечия. «Твиты» нельзя редактировать ни в полной, ни в мобильной версии микроблогов, и это очень ценно для исследователя, поскольку не даёт возможности автору исправить написанное. Тексты в сети Instagram всегда сопровождаются фотографией, задающей тему обсуждения, они не ограничены по объёму, однако в условиях данного ресурса технически сложно оформлять длинные сообщения. Различные бесплатные площадки для блогов позволяют создавать тексты любого объёма, а также редактировать их в любой момент времени, и, хотя авторы крайне редко вносят грамматические и стилистические правки, потенциально эта возможность усложняет работу исследователя.

Предварительный анализ источников показывает, что в настоящий момент можно говорить о существовании минимум двух видов городского просторечия. Во-первых, это речь людей старшего поколения, которые приехали в город много лет назад и постепенно ассимилировались. На этом уровне интересно наблюдать взаимопроникновение систем русского и белорусского языков и белорусских диалектов. Следует заметить, что в данном случае не имеет значения уровень образования говорящего. В современном мире люди часто переезжают из региона в регион в связи со служебной необходимостью в любом возрасте (и чаще всего после 40–50 лет). По этой причине у представителей старшего поколения значительно выражены фонетические черты городского просторечия («белорусский акцент»). В речи носителей этого вида городского просторечия часто встречаются диалектные и профессиональные лексемы.

Второй вид городского просторечия — речь молодёжи. Молодые люди ведут более динамичную социальную жизнь, активнее пользуются интернет-сервисами, более открыты, и это позволяет глубже изучать особенности их речи и культуры. В этой среде отчётливо наблюдается противопоставление «свой» — «чужой», «местный» — «приезжий» [3], что отражается в выборе лексики и создании новых слов и других языковых единиц для установки границ (*понаехи*, *агрогорожане* и подобные).

Известно, что просторечие в классическом понимании не осознаётся говорящими как языковая неправильность. Молодые

ЗМЕСТ

ПЛЕНАРНЫЯ ДАКЛАДЫ 3
Акушэвіч А. А. (Мінск) Элементы «свяшчэнных» моў у творчай спадчыне Францыска Скарыны 3
Барадзіна Ю. С. (Мінск), Гецэвіч Ю. С. (Мінск) Апрацоўка колькасных выразаў з адзінкамі вымярэння: ад навукова-тэхнічнага тэксту да тэлеметрыі 7
Занковец А. А. (Минск) Белорусское городское просторечие: основные направления исследования 12
Светашёва Т. А. (Минск) Феномен игры в поэзии русских неоавангардистов 16
СЕКЦЫЙНЫЯ ДАКЛАДЫ 23
Авдей З. А. (Минск) Хронотопические проекции фантастических произведений Э. Т. А. Гофмана на современную белорусскую литературу 23
Авдей И. М. (Минск) Особые случаи употребления артикля с количественными числительными в итальянском языке 28
Александрова М. А. (Минск) Образ колокола в лирике Леонида Губанова 31
Антонова Е. В. (Минск) Символика смерти в романах Итало Звево 35
Арыстава В. І., Трушкевіч А. С., Цэдрык Л. Ю. (Мінск) «Дом» як адна з культурных каштоўнасцей у творах беларускай літаратуры 40
Балабанович И. С. (Минск) Образ Петербурга в сборнике А. Кушнера «Холодный май» 43
Безруков А. Н. (Бирск, Россия) Онтология художественного дискурса 48
Біруля К. В. (Мінск) Ідэйна-мастацкая змястоўнасць апавяданняў Казіміра Сваяка 53
Бондарь В. В. (Полоцк) Концепт Деда Мороза в современной русскоязычной культуре 57
Буденис О. Г. (Гродно) Семантическая парадигма отыменных предложных сочетаний со значением ‘границы локума’ 61

Буйноўская В. М. (Мінск) Стылёвая адметнасць перакладу «Слова пра паход Ігара» В. І. Дарашкевіча 65
Букатая А. М. (Минск) Модель семьи в повестях Чжан Лин 70
Валовень О. Н. (Минск) Герой-трикстер в системе персонажей трилогии «Властелин Колец» и сказки «Хоббит» Дж. Р. Р. Толкина 75
Валчок Н. І. (Баранавічы) Асоба Цёткі ў мастацкім паказе Венанцы Бутрыма 80
Варабей М. П. (Мінск) Рэцэпцыя гісторыі ў дрэздэнскіх «Дзядах» Адама Міцкевіча 84
Вильтовская А. А. (Минск) Особенности построения системы упражнений при обучении русскому языку как иностранному 88
Глазман Л. Я. (Віцебск) Асаблівасці мадэрнісцкага светабачання ў апавяданнях Максіма Гарэцкага 92
Гоза Т. Г. (Минск) Имена собственные в русской поэтической венециане XX века 96
Grabicka Grażyna (Szczecin) Польская паремиология о женщине: фрагмент языковой картины мира 100
Гюнтар А. В., Гецэвіч Ю. С. (Мінск) Падрыхтоўчы этап стварэння дапаможнага рэсурса па вывучэнні фанетыкі беларускай мовы 104
Жуковец В. В. (Минск) Переводы одного стихотворения Ли Шаньиня: лингвокультурологический аспект 107
Завадская А. И. (Минск) Архетип пещеры в романе М. Турнье «Пятница, или Тихоокеанский Лимб» 112
Зинкович Е. В. (Минск) Теоретические основы классификации деловых игр при обучении английскому языку 116
Зуева О. В. (Минск) Текстообразующая функция разговорных синтаксических конструкций в «Житии инока Епифания» 120
Кажарновіч М. П. (Браціслава, Універсітэт Каменскага) Антрапанімічная метафара як носьбіт культурнай інфармацыі (на матэрыяле беларускіх і славацкіх медыятэкстаў) 126
Калеснікава А. А. (Мінск) Намінатыўнае поле канцэпту «радзіма» 131
Капец К. С. (Баранавічы) Вобраз пустыні ў паэзіі Івана Лагвіновіча 135
Коржаневская Ю. С. (Новополоцк) Каравай как концепт русской культуры 138